# ЗАЎТРА, 5-га СНЕЖНЯ—ДЗЕНЬ КАНСТЫТУЦЫІ СССР

ПРАЛЕТАРЫІ ЎСІХ КРАІН, ЯДНАЙЦЕСЯ!

# Гомельскі УНІВЕРСІТЭТ

ОРГАН ПАРТКОМА, РЭКТАРАТА, КАМІТЭТА ЛКСМБ, ПРАФКОМА І МЯСЦКОМА ГОМЕЛЬСКАГА ДЗЯРЖАЎНАГА УНІВЕРСІТЭТА

№ 35 (235) | Субота, 4 снежня 1976 года. | Газета заснавана ў верасні 1969 года. Выходзіць раз у тыдзень | Цана 2 кап.




## ЗАКОНЫ НАШАГА ЖЫЦЦЯ

Сёлета Дзень Канстытуцыі адзначаецца ў абстаноўцы вялікага палітычнага і працоўнага ўздыму, выклікаyага паспяховым выкананнем заданняў дзесятай пяцігодкі. Адной з важнейшых умоў вялікіх поспехаў, якіх дасягнуў савецкі народ у барацьбе за пабудову камунізму, з'яўляецца тое, што ўсё жыццё нашага грамадства будуецца на аснове самай шырокай дэмакратыі.

Наш савецкі лад жыцця — найглыбейшы дэмакратызм, які забяспечвае шырокія правы і свабоды ўсім працоўным. Гэта — замацаваныя Канстытуцыяй правы на працу і адпачынак, на адукацыю і сацыяльнае забеспячэнне, раўнапраўе грамадзян незалежна ад полу і нацыянальнасці.

Ужо за першыя дзесяць гадоў Савецкай улады толькі ў якасці дэлегатаў з'ездаў, а таксама членаў Саветаў і выканкомаў, у кіраванні дзяржавай удзельнічала 12,5 мільёна чалавек. Выбраннікі народа, арганізуючы і згуртоўваючы вакол сябе актыў, праходзілі нялёгкую, часам суровую, але высакародную школу кіраўніцтва справамі краіны. Яны мужнелі і гартаваліся ў барацьбе за перамогу ленінскай лініі партыі, забяспечваючы актыўны ўдзел Саветаў у стварэнні сацыялістычнай індустрыі, ажыццяўлялі самую цяжкую пасля заваёвы ўлады задачу перакоду сельскай гаспадаркі на рэйкі буйной калгаснай вытворчасці.

Ва ўмовах будаўніцтва сацыялізму і камунізму навукова-тэхнічны прагрэс стварае дадатковыя прадпасылкі для прыцягнення мільёнаў працоўных да кіравання грамадскімі справамі. Гэта не можа не адбіцца на саставе прадстаўнічых органаў улады, якія фарміруюцца з насельніцтва. Вось, напрыклад, якія змены адбыліся ў якасным саставе дэпутатаў мясцовых Саветаў Беларускай ССР за апошнія пяць гадоў. Колькасць дэпутатаў, якія маюць вышэйшую адукацыю, павялічылася на 8,9 працэнта і цяпер складае 23,3 працэнта ад агульнай колькасці дэпутатаў, з сярэдняй адукацыяй — на 19,9 працэнта, з пачатковай — зменшылася на 24,2 працэнта і складае 5,5 працэнта. 166 дэпутатаў маюць вучоныя ступені і званні. Расце рабочая праслойка сярод дэпутатаў. Калі ў 1963 годзе рабочыя складалі 23,6 працэнта ад агульнай колькасці дэпутатаў, то ў 1973 годзе—33,8 працэнта.

Сярод дэпутатаў мясцовых Саветаў краіны 56,2 працэнта беспартыйныя, 48,1 працэнта—жанчыны, 30,1 працэнта—моладзь ва ўзросце да 30 гадоў. У Саветах прадстаўлены ўсе нацыі і народнасці СССР. Гэты састаў адпавядае сацыяльна-класавай структуры сталага сацыялістычнага грамадства.

Характэрная рыса сацыялістычнага дэмакратызму — сістэматычнае абнаўленне саставу дэпутатаў. Так, у чэрвені 1975 года ў мясцовыя Саветы зноў абрана 44,8 працэнта дэпутатаў. А за апошнія два дзесяцігоддзі школу дзяржаўнага кіравання ў Саветах прайшло звыш 20 мільёнаў чалавек. Акрамя таго, у рабоце Саветаў пастаянна ўдзельнічае шырокае кола грамадскіх актывістаў.

У краіне дзейнічае больш 50 тысяч Саветаў, пачынаючы ад Вярхоўнага Савета СССР і заканчваючы сельскімі, пасялковымі Саветамі дэпутатаў працоўных.

Практыка будаўніцтва сацыялізму выпрацавала шматлікія формы непасрэднага ўдзелу працоўных у вырашэнні карэнных пытанняў жыцця нашага грамадства. Напрыклад, найбольш дзейснай формай вытворчага самакіравання з'яўляюцца рабочыя сходы і вытворчыя нарады. Творчасцю мас створана многа новых форм аб'яднанняў працоўных, якія садзейнічаюць іх уцягненню ў кіраванне. Да гэтых форм можна аднесці грамадскія бюро эканамічнага аналізу, саветы маладых спецыялістаў, грамадскія канструктарскія бюро, таварыствы вынаходнікаў і г. д.

Узрастае ў кіраванні сацыялістычным грамадствам і роля прафсаюзных, камсамольскіх, кааператыўных і іншых грамадскіх арганізацый. Уся іх дзейнасць накіроўваецца на далейшае развіццё ініцыятывы працоўных, выкарыстанне рэзерваў і павышэнне эфектыўнасці вытворчасці, пераўтварэнне ў жыццё гістарычных рашэнняў XXV з'езда КПСС.

**В. КУРБАТАЎ,**
**выкладчык кафедры навуковага камунізму.**

## НА ВУЧОНЫМ САВЕЦЕ

Пазаўчора адбылося чарговае пасяджэнне Вучонага савета ўніверсітэта. Першым і важнейшым на яго парадку было пытанне «Аб удасканальванні падрыхтоўкі спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй без адрыву ад вытворчасці», з дакладам па якому выступіў прарэктар па завочнаму і вячэрняму навучанню А. І. Балтоўскі.

Інфармацыю аб выніках навукова-даследчай работы ў вышэйшых навучальных установах Міністэрства вышэйшай і сярэдняй спецыяльнай адукацыі Беларусі зрабіў прарэктар па навуковай рабоце М. В. Навучыцель.

Вучоны савет заслухаў справаздачы старшых навуковых супрацоўнікаў Л. І. Нядзеля і М. В. Кухарава аб выніках іх работы.

Выбраны па конкурсу на вакантныя і перавыбраны на займаемыя пасады прафесарска-выкладчыцкі састаў.

## ВУЧОБУ ПАЧАЛІ РАБФАКАЎЦЫ



**НА ЗДЫМКУ: субяседванне праходзіць Мікалай Сопат.**
Фота **А. Шчыгрова.**

Дзесяць дзён каля пакоя падрыхтоўчага аддзялення ГДУ панавалі неспакой і хваляванне. Гэта не цяжка было прыкмеціць па тварах юнакоў і дзяўчат, што групамі таўпіліся ля дзвярэй.

Вучыцца на падрыхтоўчым аддзяленні, каб на наступны год стаць студэнтамі вядучай вышэйшай навучальнай установы беларускага Палесся, пажадала больш 300 чалавек. План жа прыёму — 175. Таму перад камісіямі, якія праводзілі субясёдванне, стаяла задача адабраць самых дастойных. Асабліва, на такія спецыяльнасці, як эканоміка працы, гісторыя і біялогія, дзе на адно месца было амаль па тры чалавекі.

Пры залічэнні ў састаў слухачоў падрыхтоўчага аддзялення, або, як кажуць яшчэ, «нулявога курса», ўлічваюцца многія фактары. Канешне, перш за ўсё пад увагу бярэцца падрыхтаванасць паступаючых. Сярэдняя адзнака атэстатаў, якая ў цэлым складае чатыры балы, сведчыць аб тым, што ва ўніверсітэт прыйшлі людзі з дастаткова грунтоўнымі ведамі. Многія юнакі і дзяўчаты прайшлі добрую працоўную загартоўку, маюць па два і больш гадоў стажу.

...Мінулі дні субясёдвання. Загадчыца падрыхтоўчага аддзялення Л. Д. Ваўкагон з задавальненнем гаворыць аб выніках новага набору. Сярод залічаных слухачамі — 18 кандыдатаў у члены КПСС і членаў партыі, нямала такіх, што праявілі сябе як камсамольскія і прафсаюзныя актывісты.

Спецыяльнасць фізіка выраішыў набыць Мікалай Сопат. За яго плячыма ўжо Бабіцкая сярэдняя школа Рэчыцкага раёна, якую закончыў з добрымі і выдатнымі адзнакамі, год працы слесарам у майстэрні саўгаса, служба ў радах Савецкай Арміі.

## ВІНШУЕМ!

**Рэктарат, партком, грамадскія арганізацыі ўніверсітэта, калектыў выкладчыкаў і студэнтаў біялагічнага факультэта горача віншуюць асістэнта кафедры батанікі і фізіялогіі раслін ВЕРАМЕЙЧЫКА Васіля Яўстратавіча з зацвярджэннем яго ВАКам у вучонай ступені кандыдата сельскагаспадарчых навук.**

## ДА ЎВАГІ КУРАТАРАЎ!

Паведамляецца прыкладная тэматыка палітычных інфармацый сярод студэнтаў ГДУ у снежні 1976 года.

### І. ПЫТАННІ ПАЛІТЫЧНАГА ЖЫЦЦЯ

1. Працаваць лепш, больш эфектыўна, з максімальнай аддачай (аб мабілізацыі працоўных калектываў, кожнага работніка на паспяховае ажыццяўленне сацыяльна-эканамічных задач, пастаўленых кастрычніцкім (1976 г.) Пленумам ЦК КПСС).

Матэрыял публікуе газета «Советская Белоруссия».

2. Непарушны саюз народаў-братоў (30 снежня — Дзень утварэння Саюза Савецкіх Сацыялістычных Рэспублік).

Матэрыялы публікуюць усе газеты.

3. Развіццё савецкай школы — агульнанародная справа (з серыі гутарак аб сацыяльнай палітыцы нашай партыі і дзяржавы ў святле рашэнняў XXV з'езда КПСС).

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

### ІІ. ПЫТАННІ КАМУНІСТЫЧНАГА ВЫХАВАННЯ

4. Маральны клімат калектыву (аб стварэнні ў кожным калектыве атмасферы высокага працоўнага ўздыму, творчага пошуку, узаемнай патрабавальнасці, аб далейшым развіцці ідэйна-маральных пабуджальных матываў да высокапрадукцыйнай і высакаякаснай працы).

Матэрыял публікуе газета «Знамя юности».

5. Прафесійныя майстэрства і культура: як ты іх павышаеш? (Аб неабходнасці сістэматычнага павышэння кожным работнікам сваёй кваліфікацыі, майстэрства, прафесійнай кампетэнтнасці, аб эфектыўным прымяненні новых ведаў і ўмення ў практычнай рабоце).

Матэрыял публікуе газета «Чырвоная змена».

### ІІІ. ПЫТАННІ МІЖНАРОДНАГА ЖЫЦЦЯ

6. XXXI сесія Генеральнай Асамблеі ААН: надзеі і вынікі.

7. Антыкамунізм — зброя імперыялістычнай рэакцыі (з серыі гутарак па выніках Берлінскай канферэнцыі камуністычных і рабочых партый Еўропы).

8. Ліван: становішча нармалізуецца.

Матэрыял публікуе газета «Звязда».

# Літаратурная старонка

## ЗНАЁМЦЕСЯ: МІХАСЬ МАРАЧКОЎСКІ

**Міхась Марачкоўскі нарадзіўся ў 1955 годзе ў в. Страград Кармянскага раёна. У 1972 годзе закончыў мясцовую сярэднюю школу і адразу ж паступіў у ГДУ. Зараз Міхась займаецца на пятым курсе гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**Друкаваўся ў кармянскай раённай газеце «Зара над Сожам».**

**Сёння мы прапануем чытачам тры новыя вершы М. Марачкоўскага.**



### РИСУЕТ СЫН ОТЦА...

Художник.
Кисти.
Холст
и пёстрых красак стая.
Горит земля.
Багровый смерч.
А впереди —
солдат с винтовкою
из пламя выступая,
с картинной рамки
в жизнь пытается сойти.
Рисует сын отца,
который в сорок первый
решительно шагнул,
за жизнь идя на смерть,
чтоб больше никогда
по чутким мира нервам
не растекалась боль
и огненный не вспыхнул
смерч.
Рисует сын отца,
что стал моложе сына,
сравнявши с вечностью
последний в жизни год.
Рисует сын отца...
И через миг картина
штрихами прошлого,
как память, оживёт.

### Расстрелянные стихи

*Памяти Гарсиа ЛОРКИ*

Рвалась планета от боли
с орбиты.
Пули бездумные —
к мукам глухи.
Гибли поэты,
а в сердце пробитом
с ними расстреляны были
стихи.
В землю сырую
в безмолвьи суровом
кровью облитые строки
легли.
Но родились непокорные
снова!
Песней бессмертной
с могил проросли.

### СЛОВА

Слова, как осы,
жалят порой.
Слова —
дробящие что-то в мозгу.
Слова
бывают сорной травой,
слова —
бессильные, как «не могу».
Слова
паутиной липнут к губам.
Слова сгорают
на полпути,
когда в оправданье их
сыплют
нам,
вину учуяв,
забыв «прости».
Слова скрывают,
слова продают.
Слова пугают,
как жёсткий кнут.
Слова убивают,
как кулаки,
слова —
оскорбительные плевки.
От слов отрекается
без стыда
совсем не склерозная
голова...
Молчание — золото
только тогда,
когда золотые ищут
слова!

КАРОТКІЯ АПАВЯДАННІ

## РАДАСЦІ НЕ АДБЫЛОСЯ

З ПАЛЯВАННЯ Васіль вяртаўся ў добрым настроі. Яшчэ б! У паляўнічай сумцы час ад часу варушылася параненая качка. Яе нёс малому Толіку.

Толік любіць качак. Дома і корміць іх, і наглядае на сажалцы. «Адзінай, ды амаль жывой, будзе ўдвая рады», — разважаў Васіль. Выйшла ж наадварот.

— Толік, я качку табе прынёс. Глядзі — жывая, — ледзь пераступіўшы парог, сказаў Васіль пляменніку.

— Качка! І сапраўды жывая.

Толік ускочыў з услончыка, кінуў сцізорык (скабліў бульбу) і наблізіўся да качкі, якая яшчэ трапяталася на падлозе. Качка спуджана пазірала на прысутных у хаце і намагалася кудысьці схавацца. Але ёй перашкаджала перабітае крыло.

— Ой! Ёй жа баліць, параненая яна!

Толікаў тварык сказіўся, і малы заплакаў.

— Ёй жа баліць! — гаварыў скрозь слёзы хлопчык. — Навошта вы яе паранілі, дзядзя?

Усе маўчалі. Толькі румзаў малы Толік:

— Ы-ы-ы... Бессардэчны...

Тым часам качка дайшла. Яна ляжала пад сталом, куды дабралася ў апошніх сутаргах.

Васілю зрабілася не па сабе. Ён стаяў, апусціўшы рукі, пунцовы, як рак. І трэба ж! «Радасць», якую нёс Толіку, аказалася непатрэбнай малому.

## ШАРЫКАВА КРЫЎДА

Добрыя бацькі ў Адася. Я гэта адчуў яшчэ адразу ж, калі прыехалі. Ледзь паспелі пераступіць парог, а яны ў абдымкі.

— А, сыночак, а родненькі! Колькі дома не быў!

Па праўдзе кажучы, дома Адась быў не так і даўно. З месяц, магчыма, не больш. Але ж для бацькоў студэнта — гэты месяц, што год.

А сёння, адведаўшы дранікаў з верашчакай, Адась рашыў паказаць мне сад. Яблыкаў у ім — процьма. Усе спелыя—спелыя. Асабліва вабяць антонаўкі. Буйныя і налiўныя, нават семачкі прасвечваюцца.

У садзе навязан сабака. Відаць, для ахоўных мэт. Маленькі, але на дзіва злюшчы. Ледзь не захлынаецца ад брэху. Калі б шчапіўся — няйначай пакусаў бы.

— Гэта Шарык, — заўважае Адась. — Звяглівы.

— Бачу.

— Шарык! — заве сабаку Адась.

Шарык не брэша. Падцяўшы хвост, ён хаваецца ў будцы і больш адтуль не вылазіць.

— Чаго гэта ён? — пытаюся.

— Так, не вылезе з будкі, пакуль я тут.

— Хіба баіцца цябе?

— Ды, як сказаць... Потым раскажу.

Увесь той дзень мне не цярпелася даведацца аб прычыне дзіўных паводзін Шарыка.

— Чаму ж ён хаваецца ад цябе? — спытаў я Адася, калі вярталіся з рыбалкі.

— Хто?

— Ну, Шарык.

— Ох іназола ж ты, Віцька.

Адась хвіліну маўчаў, відаць, раздумваў: гаварыць ці не. Затым сказаў:

— Нічога асаблівага. Адлупцаваў я Шарыка, калі ён быў яшчэ малы, за тое, што ката пашкумардзіў. Вось ён і затаіў на мяне крыўду.

Дзіўна было такое пачуць: сабака пакрыўдзіўся. Як чалавек, калі зрабіць яму непрыемна. Але то была праўда.

**А. ШВЕДАЎ,**
**студэнт гісторыка-філалагічнага факультэта.**

**Сергей СТЕШЕЦ**

* * *

Заколдованным кругом,
Огибая кусты,
Ты ходила по лугу—
Собирала цветы.
А ромашку сыскала,
И её лепестки
С замираньем срывала
И сдувала с руки.
С лепесточком последним
Я мгновенье ловлю
И целую победно,
Не тревожься — люблю!

**Ирина БОГДАНОВИЧ**

* * *

Я знаю, это бред, а не поэзия.
Ломается душа, душа кричит
И точит рифм бесформенное
лезвие,
И точит строф нелепые мечи.
От самоучки до венца
умельца
Как труден путь, но если,
наконец,
Твои мечы кому-то ранят
сердце,
Тогда поймёшь: ты мастер,
ты кузнец.

* * *

Мне имя твое рассказало
О тихой прохладе лесной,
О диком цветке краснотала,
О звонкой капели лесной,
Мне имя твоё рассказало,
Как яблоня в мае цвела.
Всё лучшее в жизни,
что знала,
Я с именем этим сплела.
Мне имя твоё рассказало,
Как ласточка песню поет,
Да только весны
не хватало,
Чтоб выразить имя твое.

* * *

Такую тишь, как можно
не любить?
В такой рассвет, как можно
не поверить?
Как почка раскрывается,
чтоб жить,
Так мы судьбе распахиваем
двери.
Пробился в роще ландыш,
забелев,
И расцвели в саду
невесты-груши.
Как всходы на растопленной
земле
Мы поднимаем к солнцу
наши души.
И, очищая мыслей глубину,
Идя к заветной и высокой цели,
Благодарю я вновь
свою страну
И песню, не закованную
в цепи.
А если, силой темной полетев,
В наш дом ворвется ветер
неудачи,
Я сберегу земли родной
напев —
Я не сумею поступить
иначе.

**Анатоль ЗЭКАЎ**

### НЕПРЫРУЧАНАЯ ПТУШКА

**Як шаша — нібы стужка—**
**За пагорак вільне,**
**Непрыручанай птушкай**
**Ты ўцячэш ад мяне.**
**І дарэмна — я знаю —**
**Ўслед ляцець за табой.**
**Ты зусім не ручная,**
**Ты не станеш ручной,**
**Хоць на сэрцы трывожна,**
**Толькі, пэўна, ужо так:**
**Без мяне жыць ты можаш,**
**А без волі — ніяк.**

* * *

**Парою плётак наплятуць**
**І нізашто абразяць.**
**Спачатку граззю абальюць,**
**Затым змяшаюць з граззю.**
**І паспрабуй ім дакажы,**
**Што ты тут не віноўны,**
**Калі да іхняе душы**
**Ўжо не даходзяць словы.**

## СУСТРЭЧА З АМАТАРАМІ ПАЭЗІІ

**Пашыраецца і ўмацоўваецца сувязь членаў літаратурнага аб'яднання «Крыніцы» нашага ўніверсітэта з чытачамі, з вучнёўскай і рабочай моладдзю, якая любіць і цэніць мастацкае слова.**

**Гэтымі днямі кіраўнік літаб'яднання выкладчык кафедры беларускай літаратуры Віктар Ярац, маладыя паэты, студэнты гісторыка-філалагічнага факультэта Анатоль Зэкаў і Сяргей Сцешац былі гасцямі рабочых Гомельскага хімзавода імя 50-годдзя БССР. У Ленінскім пакоі аднаго з інтэрнатаў прадпрыемства яны чыталі свае вершы, расказалі аб развіцці сучаснай беларускай літаратуры, падзяліліся ўражаннямі, якія засталіся ад паездак па камандыроўках ЦК ЛКСМБ і Гомельскага абкома камсамола на ўдарныя будоўлі рэспублікі.**

**Аматары паэзіі засталіся шчыра ўдзячнымі за цікавую сустрэчу з універсітэцкімі паэтамі.**

